

**Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой"** (г.Брэст).
Гарнізон прыняў бой 22 чэрвеня 1941 года. Нямецкае камандаванне адводзіла на захоп крэпасці ад дзвюх гадзін да адных сутак, але апошнія ачагі супраціўлення ў ёй былі падаўлены толькі ў канцы ліпеня 1941 года.




**Мемарыяльны комплекс, прысвечаны аперацыі "Баграціён"** (Светлагорскі раён).
Першы ў свеце мемарыяльны комплекс, прысвечаны адной з самых вялікіх ваенных аперацый у гісторыі чалавецтва. 23 чэрвеня 1944 года пачалося маштабнае наступленне савецкіх войскаў, якое доўжылася больш за два месяцы. У выніку аперацыі, былі вызвалены Беларусь, часткова тэрыторыі Прыбалтыкі і Польшчы, нанесены сакрушальны ўдар па групе нямецкіх армій "Цэнтр", які канчаткова аслабіў Германію.



**Мемарыяльны комплекс "Буйніцкае поле"** (г.Магілёў).
Тут у ліпені 1941-га савецкія воіны 388-й стралковай дывізіі, работнікі міліцыі, курсанты школы НКУС і 12 тысяч апалчэнцаў 23 дні трымалі гераічную абарону горада.



**Плошча Перамогі** (г.Мінск).
На плошчы Перамогі ўстаноўлены трыццацівасьмиметровы гранітны абеліск, увенчаны трохметровай выявай ордэна Перамогі, размешчаны пастаменты з капсуламі з зямлёй гарадоў-герояў.

## Знакавыя падзеі ў гісторыі Рэспублікі Беларусь, якія маюць асаблівае гістарычнае і грамадска-палітычнае значэнне

- Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў (15 лютага)
- Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь (23 лютага)
- Дзень Канстытуцыі (15 сакавіка)
- Гадавіна трагічнай гібелі жыхароў Хатыні, знішчаных нямецка-фашысцкімі захопнікамі (22 сакавіка)
- Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі (2 красавіка)
- Свята працы (1 мая)
- Дзень Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь (8 мая)
- Дзень Перамогі (9 мая)
- Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны (22 чэрвеня)
- Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) (3 ліпеня)
- Дзень ведаў (1 верасня)
- Дзень народнага адзінства (17 верасня)
- Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі (7 лістапада)



---

ДУК «Бібліятэчная сетка Хоцімскага раёна»
Цэнтральная бібліятэка,
Аддзел маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці

213677, Магілёўская вобл., г.п. Хоцімск, пл. Леніна, 5
Электронная пошта: hotimskbib@yandex.ru
Сайт: http:hotlib.mogilev.by

**ДУК «Бібліятэчная сетка Хоцімскага раёна»**
**Цэнтральная бібліятэка,**
**Аддзел маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці**



ГОД 2022 ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

# ПАМЯТАЦЬ КАБ ЖЫЦЬ

## "Няма высакародней місіі, чым захаванне гістарычнай памяці ў імя светлай будучыні".

*Аляксандр Лукашэнка*

2022 г. згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлены **Годам гістарычнай памяці.** У дакуменце адзначана, што Год гістарычнай памяці аб'яўляецца ў мэтах фарміравання аб'ектыўных адносін грамадства да гістарычнага мінулага, захавання і ўмацавання адзінства беларускага народа.

Гісторыя — гэта падмурак, без якога немагчыма пабудаваць будучыню. Для развіцця любога грамадства вельмі важна захаваць і перадаць нашчадкам свой перажыты вопыт і назапашаныя каштоўнасці, стаўленне да герояў, перамог і паражэнняў.

Ведаць гісторыю — значыць быць патрыётам, думаючай і свабоднай асобай, якая ўмее арыентавацца ў сучасным зменлівым свеце і рабіць правільны выбар. Наш гістарычны выбар — незалежная, моцная і квітнеючая Беларусь.




### Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь - аснова захавання гістарычнай памяці народа

Значнасць тэмы гістарычнага мінулага беларускага народа знайшла сваё адлюстраванне ў абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, падтрыманай народам на рэспубліканскім рэферэндуме 27 лютага 2022 г.

У Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь унесены палажэнні, накіраваныя на захаванне гістарычнай праўды і памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, масавым гераізме народа:

- **"дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны" (арт.15);**
- **"праява патрыятызму, захаванне гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа з'яўляюцца абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь" (арт.15).**

Гэта зроблена для сённяшняга і будучых пакаленняў, для захавання духоўнага настрою беларускага грамадства, яго згуртавання і мабілізацыі на пераадоленне выклікаў, якія ўзнікаюць перад намі. Бо менавіта гістарычная памяць – маральны стрыжань грамадства, які ўмацоўвае сувязь паміж пакаленнямі ва ўмовах глабальнай нестабільнасці.

### Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці народа Беларусі

У розных кутках Беларусі, якая страціла ў 1941-1945 гадах кожнага трэцяга жыхара, створаны сімвалічныя мемарыяльныя комплексы, устаноўлены манументы, прысвечаныя падзеям самай трагічнай і кровапралітнай вайны на гэтай шматпакутнай зямлі.

Сёння ў краіне каля 9 тысяч помнікаў і пахаванняў Вялікай Айчыннай вайны. Яны ўваходзяць у ваенна-гістарычныя маршруты і экскурсіі, але галоўнае - з'яўляюцца святым месцам ушанавання загінуўшых, вечным напамінам аб тым, які бясцэнны мір.



**Мемарыяльны комплекс "Курган Славы"** (Смалявіцкі раён). Заснаваны ў гонар вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.



**Мемарыяльны комплекс "Хатынь"** (Лагойскі раён).
22 сакавіка 1943 года фашысты акружылі вёску Хатынь пасля таго, як за 6 км ад яе партызаны абстралялі нямецкую аўтакалону. У пакаранне ўсё насельніцтва Хатыні - старых, жанчын, дзяцей - выгналі з дамоў і жывымі спалілі ў калгасным хляве.



**Мемарыяльны комплекс "Дальва",** прысвечаны вёсцы з такім жа страшным лёсам: 19 чэрвеня 1944 года фашысты спалілі жыўцом 29 дзяцей, 13 жанчын і 2 мужчын.



**Помнік «Дзецям вайны»** (г. Магілёў). Бронзавыя дзеці – хлопчык і дзяўчынка прыціснуўшыся друг да друга, стаяць як быццам у праёме сваёй спусцелай падпаленай хаты. Гранітныя прыступкі "ганка" сімвалізуюць ваенныя гады.



**Мемарыяльны комплекс «Азарычы»** (Гомельская вобласць). Жорсткі лагер смерці праіснаваў усяго два тыдні, але за гэты час фашысты паспелі знішчыць не менш як 20 тысяч чалавек.

**2022 год пройдзе пад знакам захавання гераічнай спадчыны і праўды аб усіх перыядах жыцця беларускага народа.**